АПОШНЯЯ РЫБАЛКА

У нашай кампаніі рыбакоў-аматараў быў адзін, як моладзь кажа, чал. (ад чалавек), які не разменьваўся на дробязі — лавіў выключна вялікую рыбу, на бойлы (гэта як бы «клёцкі» такія — з яек, манны, мукі...). Дарагія, халера, таму чал. браў іх з сабою няшмат — тры-чатыры штукі... І рыбу падымаў рэдка: за сезон — у найлепшым выпадку — разы са два, але ж ЯКУЮ...

Найчасцей лавіліся сазаны — кілаграмаў па восем, па дзесяць. Многія на іх зайздросцілі. А Іван — той проста захварэў: вырашыў таксама перайсці на буйняк, але лавіць яго не на бойлы (што задорага), а на спецыяльныя аладкі.

З чаго ён іх толькі не пёк! І чым толькі зверху не здобіў — мёдам, часнаком, шакаладнай пастай... Буйняк жа ўпарта не кляваў — ні раней, ні ў той раз: мы, рыбакі, кучкаваліся вакол кавы і піва, пакуль...

Спінінг Івана — стары, праверaны часам, з «неўскаю» шпулькай — не клюнуў канцом у ваду.

Рыбак кінуўся да вудачкі — паспрабаваў зрабіць падсечку, але спінінг проста злажыўся папалам, а затым вырваўся з рук і... кануў (?!) у ваду.

Змірыцца з гэтым Іван (у іншых абставінах чалавек разважлівы) ну ніяк не мог: нырнуў услед за спінінгам (у кастрычніку!), ухапіў, адчуў, што на тым канцы — РЫБА!.. Мо на цэлы пуд!..

І мы яе — яго, сазана! — такі ж дасталі — усім «калгасам»!

...Праз пару дзён Іван — чаго ніколі не было — запрасіў на вячэру, на сазаняціну.

Прычына нечуванай шчодрасці раскрылася пры дэгустацыі. У смажаным выглядзе рыбу было не ўгрызці, у тушаным — не праглынуць, студзень з галавы пахам нагадваў сталярны клей...

Што навеяла — яшчэ адзін досыць смешны ўспамін.

...Сяргею, зусім не рыбаку, проста ўдзельніку выезду, мы ўручылі тады буйнога дзікага карпа — кілаграмаў на сем. У той жа вечар ён пазваніў — папрасіў падысці да яго пад'езда, і ўсім, хто з'явіўся, уручыў па пакеце з кавалкамі рыбы.

Мы, вядома ж, спыталі, з чаго б?

І Сяргей расказаў, што, толькі пачаўшы чысціць трафей, мякка кажучы, «удзелаў» усё — не толькі на сабе, але і на кухні...

Прыйшлося раздзецца (што важна — да чырвоных плавак) і з рыбінай перайсці ў ванны пакой — чысціць там, не ўмеючы ды яшчэ і спехам, каб усё прыбраць да прыходу жонкі, але...

Яна з сяброўкай пасля ўдалага шопінгу з'явілася раней. З парога папрасіла, каб дапамог «разгрузіцца».

Сяргей, вядома ж, паслухаў: голы, увесь у крыві, з гэткім жа акрываўленым цесаком выйшаў насустрач, ад чаго адна з жанчын дзіка заверашчала, другая — у непрытомнасці — па сценцы «спаўзла» на падлогу...

Калі жарсці ўлягліся, гатаваць тога карпа гаспадыня адмовілася — наадрэз. І Сяргея на рыбалку болей не пусціла.

А мо і сам не захацеў.

Алег Іваноў,

г. Масква.

УРОК ДЛЯ МАЖОРАЎ

Некалі, у далёкія 80-я мінулага стагоддзя, у адну з нашых вёсак панадзіліся два кавалеры — ды такія крутыя!

Зрэшты, гэтага слова ў адносінах да людзей яшчэ не было, а вось яны самі...

Брат аднаго ў «загранку» хадзіў, бацька другога мясцовым багацеем лічыўся. Таму хлопцы, абодва, «рассякалі» на матацыклах «Ява» (калі ў большасці ні «мінскачоў», ні старэнькіх «Іжоў» не было), фарсілі ў фірмовых джынсах ды куртках-варанках, ганарыліся японскімі магнітафонамі...

І ў адну з субот заляцаліся да адных дзяўчат (запрашалі танцаваць, праводзілі дадому, прызначалі спатканні...), а ў наступную кліны падбівалі ўжо да іншых, балазе, дзяўчат там шмат было: і тых, што адвучыліся і ў вёсцы працавалі, і тых, хто прыехаў на канікулы, і школьніц-старшакласніц... Многіх хлопцы «матросілі», аж пакуль не нарваліся на дзвюх вясёлых сяброўак... Яны — Таня з Алёнай — як толькі зразумелі, што «свята» прыйшло на іхнюю вуліцу, хуценька і цішком распрацавалі план — сталі дзейнічаць. Ну, па-першае, зрабілі выгляд, што проста без памяці ад увагі сваіх кавалераў! Па-другое, зманілі пра ўзрост — «прыкінуліся» студэнткамі. Па-трэцяе, дазволілі сябе не проста праводзіць...

Пачатак аперацыі быў удалы: адна парачка збочыла на сцежку, што вяла да хаты... Танінай прабабулі. У сенцах дзяўчына папрасіла кавалера пачакаць, пакуль яна праверыць, ці спяць бацькі, а сама тым часам адчыніла люк у падвал, што знаходзіўся адразу ж за парогам, і гучна прашаптала: «Заходзь. Усё ў парадку!»

Куды «зайшоў» Дзіма, казаць, напэўна, не трэба? Вышыня там была невялікая, для мякчэйшай пасадкі Таня кінула ўніз сеннічок, на якім звычайна спаў сабака, і, хуценька апусціўшы люк, усцягнула на яго нажную швейную машыну і цяжкаваты куфэрак з абрусамі ды ручнікамі...

Алёна ж тым часам запрасіла Вову ў... Таніну хату (нібыта ў сваю, бо да сваёй далёка ды і не па плане): у веранду, у невялікую летнюю кухню... Папрасіла залётніка там пачакаць. Сама ж паўз ложак у пакоі, дзе звычайна прымалі гасцей, а цяпер чамусьці спаў Танін дзед, прайшла да акна і сіганула ў кветнік.

Па плане яна павінна была знадворку падперці дзверы ў хату, але... прачнуўся дзядуля. «Гэта хто тут аціраецца?!» — гучна папытаўся ён, двухметровы асілак, ад чаго Воўка аж падскочыў — даўся галавой у самаробную паліцу, перакуліў на сябе каструльку з кісялём і выскачыў у веранду, дзе ўжо пстрыкнуў выключальнік і асвятліў «групу захопу» — грознага дзеда Сямёна ў кальсонах, маленькую бабулю Надзю з чапялой наперавес і Танінага тату з прасам у руцэ.

Воўка — з малінава-кісельным чубам — кінуўся з хаты, але дзед паспеў схапіць яго за кішэнь штаноў-«бананаў» і выдраць яе, што называецца, з мясам...

Таня з Алёнай у кутку паміж сцяной і верандай паўзлі ад смеху.

...Дзіма, як даведаліся пасля, вылез з падвала праз акенца, у якое звычайна ссыпаюць бульбу (прабабуля, мякка кажучы, глухаватая, нават не прачнулася). Вова нацярпеўся таксама...

Не дзіва, што абодвух ганарліўцаў у вёсцы болей не бачылі. Мо даліся ў іншы бок дурыць галовы дзяўчатам. А можа, урок пайшоў на карысць?

Алена Несцяронак,

г. Докшыцы.

ТРЫМАЙ ГАЛАВУ Ў ХОЛАДЗЕ, ЖЫВОТ У ГОЛАДЗЕ... А ЗУБЫ — ДЗЕ?

Антось — мужчына што трэба: пры пасадзе, сям'і, з прывабнай знешнасцю, з падвешаным языком. Такім, згадзіцеся, прасцей знаёміцца, весці перамовы, кантактаваць, жартаваць з жанчынамі...

У Антося, праўда, не больш: жонцы ён не здраджваў ніколі, хоць па санаторыях ездзіў і ў камандзіроўках быў… Часам, здаралася там, кагосьці кадрыў, але ж розуму пры гэтым не траціў: адчуўшы небяспеку, хуценька здаваў назад…

Даўнавата гэта было — у маладосці, а пад старасць...

Адкуль што ўзялося? Здаецца ж, і стаматолагаў слухаў, і як след даглядаў, а зубы ўсё роўна страціў — адзін за адным, на нейкім шостым дзясятку... Замест беленькіх ды роўненькіх, сваіх, з'явіліся штучныя...

Камплексаваў Антось. Толькі жонка бачыла, як ён нанач здымаў пратэз, як апускаў яго ў шклянку альбо клаў пад падушку.

І днём быў асцярожным: нічога цвёрдага не кусаў, адмовіўся ад пікнікоў на прыродзе, бо новыя зубы пасля закускі часам трэ было даставаць, паласкаць...

Карацей, бярогся чалавек, ды на прыгоду ўсё ж нарваўся.

На рабоце далі яму пуцёўку ў санаторый. Жонка адпраўляла спакойна: едзь, маўляў, ды глядзі, калі нейкую пацалуеш, то лепей у шчочку… «Не хвалюйся, — у тон ёй адказаў Антось. — Я равесніц буду кадрыць, каб раніцай пратэзы не зблытаць».

Было там што ці не, гісторыя замоўчвае. Факт, што непадалёк ад таго санаторыя жылі Антосевы сваты. Ён гадоў з дзесяць у іх не быў. «Заеду, дзён колькі пабуду», — тэлефануе сваёй палавіне. Жонка не супраць, хоць якраз тады ў яе дзень нараджэння... Дата, праўда, не круглая... «Без мяне пасвяткуеце, — прапанаваў Антось. — А потым яшчэ і ўдваіх пасядзім».

Як надумалі, так зрабілі. На верандзе, за святочным сталом, чалавек з дзесяць сабралася. Павіншавала матулю дачка, сказала тост супрацоўніца — выпіць не паспелі: паштальёнка зайшла:

— Атрымайце, — кажа, — і распішыцеся. Бандэролька вам.

— Якая? Адкуль? — дзівіцца гаспадыня і тут жа бачыць: з санаторыя. Значыць, Антоська нешта прыслаў?!

— Мусіць, завушнічкі! — уголас падумала дачка.

— Не, мяркуючы па каробачцы, духі, — запярэчыла суседка.

— Мне мой ахламон, — цяжка ўздыхнула каляжанка, — ніколі і нічога не прысылаў.

Гаспадыня тым часам з хваляваннем разгарнула пакунак, у якім — ніхто не згадаўся — былі не завушніцы. Не духі, а... зубны пратэз. І кароткі ліст з санаторыя: так і так, маўляў, прыбіраючы нумар, пакаёўка знайшла — у тумбачцы...

Смеху надоўга было — і за сталом, і потым, калі Антось прыехаў дадому. Жонцы сказаў, што прапажу «заўважыў» праз гадзіну пасля ад'езду, але ж падумаў, што пратэз у сумку паклаў...

Калі там не знайшоў, вырашыў: па дарозе ад родзічаў заедзе ў санаторый і забярэ. А тут во які канфуз атрымаўся — не перад нейкай залёткай дык перад жонкай.

Віктар Сабалеўскі,

г. Узда.

Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.

Ад яе ж.

Першая з сённяшніх гісторый (у досыць вольным перакладзе з рускай...) — з кнігі «Пра рамантыку, рыбалку, людзей і норавы» (Мінск, Выдавецкі дом «Звязда», 2023). Будуць, на жаль, і апошнія — прынамсі, у гэтым годзе... Конкурс на найлепшую выйшаў на фінішную прамую, але шанц паспець яшчэ ёсць. Пішыце!

Неасабісты суб'ектыў

Аранжавы настрой

Як перажыць лістапад

АДНА мая добрая старэйшая прыяцелька ведала, як яна казала, самы надзейны і праверaны спосаб пазбавіцца ад лістападаўскай нуды і самоты, якім ахвотна дзялілася з усімі, — аранжавы колер. Яна і сапраўды ў самыя цёмныя і кароткія восеньскія дні акружала сябе гэтым сонечным колерам розных адценняў — насіла аранжавыя кофты і шалікі, па яе кватэры паўсюль — на сталах, на падаконнях і нават на падлакотніках крэслаў — ляжалі аранжавыя фрукты — хурма і апельсіны, якімі яна шчодра частавала гасцей. Нават ашыйнік на сваю любімую балонку Боні яна ў гэты час чапляла аранжавы... Не ведаю, ці сапраўды гэты колер мае нейкую асаблівую магію, ці проста яна сама была сонечным чалавекам, але, калі адольвала лістападаўская нуда і хацелася ціхенька завыць у ранніх прыцемках, я набірала яе нумар і ехала да яе ў госці, у невялікую ўтульную кватэру ва Уруччы. Брала з сабой слоічак яе любімага абляпіхавага варэння, і гэта таксама быў наш своеасаблівы рытуал: Таццяна Паўлаўна адчыняла дзверы, а я замест прывітання працягвала ёй варэнне са словамі: «Я да вас са сваім аранжавым!» Мы пілі гарбату з аранжавых кубкаў з гэтым аранжавым варэннем, на стале горкай ляжалі аранжавыя апельсіны. Гаварылі пра што заўгодна — пра надвор'е, пра апошнія навіны, пра жыццё, і настрой пакрысе мяняўся на сонечны, і ўжо няважна было, што там на вуліцы — ліе халодны пранізлівы дождж ці шалее, ведаючы, што доўга не пратрымаецца, ранняя лістападаўская завіруха...

Некалькі разоў я прасіла ў яе дазволу напісаць пра яе лёс — без дазволу было ніяк, яна чытала нашу газету. Кожны раз чула катэгарычную адмову: «Не трэба. Вось памру, тады напішаш». Цяпер — можна. Летам тэлефанавала ёй расказаць, што абляпіхі шмат і варэнне будзе як заўсёды. Нумар быў недаступны, а праз некалькі дзён ад агульных знаёмых даведалася, што Таццяны Паўлаўны ўжо няма на свеце. Заснула і не прачнулася, сказалі ўрачы. Знайшлі яе на трэці дзень — суседзі выклікалі міліцыю, бо надта ж гучна плакала-скуголіла яе Боні.

МЫ пазнаёміліся з ёй больш чым дваццаць гадоў таму, я тады, не маючы яшчэ свайго жылля, бадзялася па здымных кватэрах. Кватэра Таццяны Паўлаўны была на адной лесвічнай пляцоўцы з такім маім часовым прыстанішчам. Мне было тады крыху больш за дваццаць, ёй заставалася пару гадоў да пенсіі. Але мы вельмі хутка знайшлі агульную мову і нават пасябравалі. Таццяна Паўлаўна была па адукацыі мастацтвазнаўцам, выкладала гісторыю мастацтва ў каледжы будучым керамістам і дэкаратарам. Жыла адна, але адзінокай ніколі сябе не адчувала, у яе часта бывалі і студэнты, і тыя, хто ўжо скончыў вучобу. Яна прыцягвала да сябе людзей сваім заўсёдным сонечным настроем, заўсёднай усмешкай, тым, што, выслухоўваючы праблемы іншых, ніколі не расказвала пра свае.

Хіба што аднойчы... Мне тады здавалася, што рухнуў увесь свет (кавалер не пазваніў і не прыйшоў), і яна, убачыўшы мой твар, на якім, напэўна, была напісана роспач невядома ў якой ступені, ледзь не сілай зацягнула мяне да сябе, наліла гарбаты ў аранжавы кубак, паклала перада мной вялікі апельсін і пачала расказваць.

ЯНА была пятым дзіцем у вялікай вясковай сям'і. Жылі бедна, як і ўсе пасля вайны. Бацька вярнуўся з фронту без рукі, часта заліваў сваю бяду беленькай і тады ганяў па вуліцы і жонку, і сваіх малых нашчадкаў. Аднойчы схапіў сякеру, і малыя кінуліся хавацца хто куды. Малая Танечка — ёй тады было тры гады — заскочыла ў будку да суседскага сабакі. Вялізная галодная псіна, у якой у будцы стаяла яе міска, толькі цудам не загрызла дзіця да смерці. Але моцна пакусала і рукі, і ногі, вырвала кавалак шчакі. З таго часу Таня крыху прыкульгвала, а на твары застаўся рваны шрам. Бацька хутка наклаў на сябе рукі — павесіўся на гарышчы, маці, застаўшыся адна з пяцю, паслухала добрых людзей і аддала меншую калеку ў інтэрнат, на дзяржаўнае забеспячэнне. Прыязджала Таня дадому толькі на канікулы, адчувала сябе чужой і нежаданай у роднай хаце. Становячыся дарослай, вельмі хацела стварыць сваю сям'ю, каб была яна такая, якую бачыла толькі ў марах, дружная і шчаслівая. Але разумела: наўрад ці атрымаецца, бо і нага з узростам не палепшала, і шнар на твары нікуды не падзеўся.

Але — усё атрымалася. Сустрэла добрага хлопца, простага будаўніка, які ў рот не браў спіртнога, а яе быў гатовы насіць на руках. Скончыла інстытут, пайшла працаваць. Нарадзіла сына, пасля дачушку. Пакрысе наладжваўся побыт — атрымалі кватэру, нават купілі дачу. Ну, як дачу — старую хату ў вёсцы. Але ж муж — залатыя рукі, сказаў, што ўсё зробіць і адрамантуе сам. І рабіў, стараўся, нават электрычнасць сам правёў. Але ж ён не электрыкам быў, мабыць, памыліўся дзесьці. Успыхнула тая іхняя хата ноччу ад кароткага замыкання. А ў хаце ён з дзецьмі-падлеткамі быў, на досвітку на рыбалку збіраліся пайсці, яна павінна была ўдзень на аўтобусе прыехаць. Прыехала — на папялішча, з якога не ўратаваўся ніхто.

АД гора ратавалася працай. Сям'я не падтрымала — яна для іх заўсёды адрэзаным кавалкам была. Але пра яе ўспомнілі, калі пасля цяжкага інсульту злягла маці. Старэйшыя сабраліся і вырашылі-пастанавілі: Таццяна адна, а ў нас ва ўсіх сем'і. Хай яна маці і даглядае. Яна не адмовілася. І дзесяць гадоў пражыла з ляжачым хворым старым чалавекам, даглядаючы, выконваючы ўсе яе капрызы. Сама яшчэ маладая жанчына, паставіла крыж нават на перспектыве штосьці змяніць у асабістым жыцці, калі б раптам рашылася пачаць усё спачатку.

Не рашылася і калі пахавала маці — тая ў клопаце і доглядзе дажыла да васьмідзесяці. Гуртавала вакол сябе моладзь — вучыла не толькі свайму прадмету, але яшчэ і жыць, не зважаючы ні на што. Сфармулявала мне ў той вечар усю філасофію існавання адной фразай, якую я ўжо калісьці чула ад сваёй бабулі: «Жывы ж у магілу не палезеш. Жыць жа неяк трэба»...

ПАЙДУ сёння ў краму, куплю апельсінаў і хурмы. Раскладу па ўсёй кватэры і буду піць гарбату з абляпіхавым аранжавым варэннем. Лістапад трэба неяк перажыць.

Алена ЛЯЎКОВІЧ.